


Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя Ул. І. ЛЕНІНА

№ 32 (645) | Пятніца, 28 кастрычніка 1966 года. | Год выдання XIX. | Цана 2 кап.




# СА СВЯТАМ!

30 кастрычніка спаўняецца 45 год Беларускаму дзяржаўнаму універсітэту імя Ул. І. Леніна. Створаны па ленінскаму дэкрэту ў «азнаменаванне Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года», наш універсітэт за гады свайго існавання ператварыўся ў буйнейшую навукова-даследчую і вучэбную ўстанову краіны, унёс вялікі ўклад у росквіт беларускай сацыялістычнай нацыі.

Амаль 20 тысяч спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі вышла са сцен гэтай старэйшай кузніцы кадраў рэспублікі. Многія з іх сталі выдатнымі партыйнымі, дзяржаўнымі дзеячамі і вучонымі, вядомымі дзеячамі літаратуры і мастацтва, заслужанымі настаўнікамі. Тысячы выпускнікоў удастоены ўрадавых узнагарод. У цяперашні час на дзённым, вячэрнім і завочным аддзяленнях універсітэта вучыцца каля 14 тысяч чалавек.

Рэктарат, партком, камітэт камсамола, мясцком і прафком горача віншуюць са святам студэнтаў, прафесарска-выкладчыцкі калектыў, аспірантаў, тэхнічных работнікаў, увесь абслугоўваючы персанал і жадаюць ім новых поспехаў у вучобе, навуковых даследаваннях, у працы і вялікага асабістага шчасця.



# 1921 ДАРОГА Ў 45 ГОД

**ДАРОГА Ў 45 ГОД. НЕВЯЛІКІ ШЛЯХ, АЛЕ НАШАГА ЮБІЛЯРА НЕ ПАЗНАЦЬ. ВЫРАСЛІ НОВЫЯ КАРПУСЫ СА СВЕТЛЫМІ АЎДЫТОРЫЯМІ, З ВЫДАТНА АБСТАЛЯВАНЫМІ ЛАБАРАТОРЫЯМІ, ВЫРАСЛІ СВАЕ НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ КАДРЫ — ВУЧОНЫЯ, ІМЁНЫ ЯКІХ ВЯДОМЫ НЕ ТОЛЬКІ Ў НАШАЙ КРАІНЕ, АЛЕ І ДАЛЁКА ЗА ЯЕ МЕЖАМІ.**

**БЕЛАРУСКАМУ ДЗЯРЖАЎНАМУ УНІВЕРСІТЭТУ ІМЯ УЛ. І. ЛЕНІНА ПРАЗ ДВА ДНІ СПАЎНЯЕЦЦА 45 ГОД. НАПЯРЭДАДНІ СВЯТА ЗА КРУГЛЫМ СТАЛОМ РЭДАКЦЫІ САБРАЛІСЯ ЛЮДЗІ, ЧЫЙ ЛЁС ТЫМ ЦІ ІНШЫМ ЧЫНАМ ЗВЯЗАНЫ З УНІВЕРСІТЭТАМ.**

**ПРАДСТАЎЛЯЕМ ІМ СЛОВА.**




## З ІМЕМ ЛЕНІНА

Як і многія іншыя народы нашай краіны, беларускі народ да Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі не меў ніводнай вышэйшай навучальнай установы. 82 працэнты непісьменнага насельніцтва — вось спадчына, якая дасталася Савецкай уладзе ў Беларусі ад царызму. Толькі пераход улады ў рукі рабочых і сялян пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі даў магчымасць працоўным рэспублікі самастойна і дзейсна вырашаць пытанні стварэння сваёй інтэлігенцыі, развіцця народнай асветы і культуры.

Яшчэ грымелі гарматы грамадзянскай вайны, яшчэ сцякала крывёю параненая белагвардзейцамі і інтэрвентамі краіна, а Уладзімір Ільіч Ленін падпісвае дэкрэт аб адкрыцці універсітэтаў. У здзяйсненне гэтага дэкрэта і быў створан Беларускі дзяржаўны універсітэт. Яго арганізацыя па вядомых прычынах зацягнулася. Толькі 11 ліпеня 1921 года ў Мінску на ўрачыстым пасяджэнні партыйных, савецкіх і прафсаюзных органаў быў абнародаваны дакрэт аб адкрыцці універсітэта, а афіцыяльнае адкрыццё адбылося некалькі месяцаў пазней — 30 кастрычніка.

Гэта было вялікае свята для беларускага народа. Гісторыя нашага універсітэта цесна звязана з імем Ул. І. Леніна, яна сведчыць аб непераможнай творчай сіле дружбы народаў. Па даручэнню Ул. І. Леніна і ўрада РСФСР брацкую дапамогу беларускаму народу ў стварэнні вышэйшай школы аказалі працоўныя Масквы і іншых гарадоў. Яны накіравалі сюды на пастаянную работу вядомых вучоных, прыслалі шмат кніг, навуковага абсталявання. Маскоўскі універсітэт дапамог распрацаваць праекты вучэбных планаў, вызначыць профіль факультэтаў. Пытанню арганізацыі універсітэта ў Беларусі вялікую ўвагу ўдзяліў народны камісар адукацыі РСФСР А. В. Луначарскі.

Бескарыслівая дапамога аказвалася рускім і іншымі народамі краіны і пазней. Дзякуючы гэтаму, дзякуючы клопатам Камуністычнай партыі, Беларускі дзяржаўны універсітэт у хуткім часе ператварыўся ў буйны цэнтр навуковых даследаванняў, падрыхтоўкі выкладчыцкіх кадраў, фарміравання нацыянальнай інтэлігенцыі. У гэтым таксама вялікая заслуга такіх вучоных, як прафесараў В. І. Пічэты (першы рэктар), В. Н. Перцава, М. Б. Кроля, Н. М. Нікольскага, М. П. Сакалоўскага, Б. Я. Эльберта, В. Н. Дзьякава, Е. Е. Сіроціна, С. Я. Вальфсона, П. І. Карузіна і іншых першых супрацоўнікаў. Універсітэт заняў вядучае месца ў развіцці вышэйшай адукацыі ў рэспубліцы. На базе яго факультэтаў былі створаны буйнейшыя вышэйшыя вучэбныя ўстановы Беларусі — політэхнічны, медыцынскі, Мінскі педагагічны інстытуты і Інстытут народнай гаспадаркі. Наш універсітэт унёс вялікі ўклад у арганізацыю Акадэміі навук БССР.

Нельга ў кароткім выступленні падрабязна расказаць пра ўсе знамянальныя падзеі гэтай старэйшай навукова-даследчай і вучэбнай установы. Па сутнасці яго гісторыя—гэта гісторыя ператварэння Беларусі ў перадавую індустрыяльную дзяржаву з развітай сельскай гаспадаркай, у рэспубліку ўсеагульнай пісьменнасці і высокай культуры. У Беларусі няма такога раёна, дзе б ні працавалі настаўнікі, юрысты, эканамісты, хімікі, біёлагі і іншыя высокакваліфікаваныя спецыялісты, якія атрымалі адукацыю ў БДУ. Універсітэт выхаваў многіх вядомых беларускіх пісьменнікаў, вучоных, дзяржаўных дзеячоў. Значную частку прафесарска-выкладчыцкага калектыву універсітэта, інстытутаў рэспублікі складаюць былыя студэнты БДУ. Яго выпускнікі з поспехам працуюць і за межамі рэспублікі.

Партыя і ўрад высока ацэньваюць уклад універсітэта ў сацыялістычнае і камуністычнае будаўніцтва. Дзесяткі яго супрацоўнікаў і выхаванцаў удастоены ўзнагарод, а 1 студзеня 1949 года Беларускаму дзяржаўнаму універсітэту было прысвоена імя Уладзіміра Ільіча Леніна.

Некаторыя параўнанні пакажуць, як вырас універсітэт за 45 год. У 1921 годзе на трох яго факультэтах займалася 1390 студэнтаў, цяпер іх каля 14 тысяч, колькасць навуковых супрацоўнікаў павялічылася амаль у шэсць разоў. 65 прафесараў і дактароў навук, 269 дацэнтаў і кандыдатаў навук, 390 выкладчыкаў перадаюць свае веды студэнтам на 8 факультэтах. Першым выхаванцам БДУ не пазнаць цяпер універсітэцкі гарадок, а што датычыцца навукова-даследчай і матэрыяльнай базы, то яна не ідзе ні ў якае параўнанне з тым, з чаго мы пачыналі 45 год назад. 180 лабараторый, дзесяткі вучэбных кабінетаў, шматлікія светлыя аўдыторыі, багацейшая ў краіне бібліятэка — усё гэта і многае іншае прадастаўлена ў распараджэнне студэнтам. Яны маюць магчымасць ўсебакова развівацца — ва універсітэце працуюць шматлікія гурткі мастацкай самадзейнасці, спартыўныя секцыі, факультэт грамадскіх прафесій і г. д.

Штогод універсітэт дае краіне многа высокакваліфікаваных спецыялістаў для розных галін народнай гаспадаркі і культуры. Разам з тым ён праводзіць вялікую навукова-даследчую работу. Дастаткова сказаць, што толькі за 1964, 1965 і 8 месяцаў 1966 года яго вучонымі былі выкананы працы па гаспадарча-дагаворнай тэматыцы больш, як на 1,8 мільёна рублёў. Навуковыя супрацоўнікі усё цясней умацоўваюць сувязі з вытворчасцю. Гэтаму садзейнічае паспяховы рост кадраў. Толькі за апошнія два гады абаронена 11 доктарскіх і 56 кандыдацкіх дысертацый. Універсітэт з гонарам можна назваць вялікай школай падрыхтоўкі навуковых супрацоўнікаў—толькі ў гэтым годзе ў яго сценах займаецца звыш 360 аспірантаў.

Выконваючы гістарычныя рашэнні XXIII з'езда КПСС, калектыў універсітэта накіроўвае ўсе свае намаганні на вырашэнне найбольш актуальных задач навукі і вытворчасці, на павышэнне ўзроўню вучэбнай і выхаваўчай работы сярод студэнтаў. Нядаўняя пастанова ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб мерах па паляпшэнню падрыхтоўкі спецыялістаў і ўдасканаленню кіраўніцтва вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй у краіне» патрабавала ад нас унесці важныя карэктывы ў свае планы. Мы вызначылі новыя профілі, па якім будзе весціся падрыхтоўка спецыялістаў у бягучай пяцігодцы, узялі на сябе абавязацельствы расшырыць навуковыя даследаванні па актуальных праблемах, дабівацца ўкаранення дасягненняў навукі ў вытворчасць. Цяпер уся краіна рыхтуецца да дзвюх знамянальных падзей — 50-годдзя Савецкай улады і 100-годдзя з дня нараджэння Ул. І. Леніна. Калектыў нашага універсітэта прыкладае ўсе намаганні да таго, каб сустрэць гэтыя даты новымі поспехамі і ўнесці дастойны ўклад у справу камуністычнага будаўніцтва.

**А. Н. СЕЎЧАНКА,**
рэктар універсітэта,
прафесар, акадэмік АН БССР.



*Аляксандр Ключнікаў—студэнт-дыпломнік з фізфака. Багацце тэарэтычных ведаў, разнастайная і незлічоная колькасць лабараторных работ ім ужо ўзяты ва універсітэце.*

## Эстафета жыцця

*Студэнт... Аспірант...*

*Гэтыя два словы сталі шырока распаўсюджанымі ў беларускай мове не вельмі даўно. Я назваў бы іх словамі-братамі. На самай справе: у іх адна маці—Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя, дый і жыць яны пачалі ў адным доме—Беларускім дзяржаўным універсітэце.*

*Чым сталей станавіўся універсітэт, чым хутчэй наша рэспубліка ішла па шляху пабудовы сацыялізма, тым усё прыкметней адчувалася неабходнасць арганізацыі пастаяннай школы падрыхтоўкі нацыянальных навуковых і выкладчыцкіх кадраў. Гэта задача была вырашана ў 1927 годзе, калі пры БДУ была створана аспірантура. Іншымі словамі—студэнт паклікаў за сабой у жыццё аспіранта. Інакш нельга было ісці наперад.*

*У 1928-29 навучальным годзе ў аспірантуру паступіла 35 чалавек. Калі зыходзіць з сённяшніх фактаў нашага аддзела аспірантуры (універсітэт налічвае 362 аспіранты, а па рэспубліцы іх колькасць перавысіла 2000 чалавек), то лічба можа паказацца мізэрнай. Але трэба памятаць, якой Беларусь была да Кастрычніцкай рэвалюцыі і што «35» — гэта быў для яе першы крок. Прычым, крок цвёрды і ўпэўнены. Аспірантура БДУ дала здольных вучоных і выкладчыкаў не толькі для універсітэта, але і для ўсіх інстытутаў рэспублікі. Таму ў дні святкавання юбілею універсітэта трэба з удзячнасцю ўспомніць тых, хто ствараў першую ў Беларусі аспірантуру.*

*Аспіранцкія справы, аспіранцкія поспехі — гэта яркая і вельмі цікавая старонка гісторыі універсітэта. Цяпер аспіранты рыхтуюцца да сваёй будучай працы амаль пры ўсіх кафедрах БДУ. Напрыклад, наша кафедра — кафедра гісторыі філасофіі і логікі за гады свайго існавання з 1953 года дала пуцёўку ў жыццё 20 аспірантам, 14 з якіх паспяхова абаранілі кандыдацкія дысертацыі. Цяпер на кафедры займаюцца і заканчваюць аспірантуру 20 чалавек. Выхаванцы кафедры працуюць ва ўсіх (акрамя Віцебска і Мозыра) гарадах Беларусі, дзе маюцца інстытуты, а таксама ў Маскве. Такімі дасягненнямі могуць пахваліцца і некаторыя іншыя кафедры.*

*Так, наш універсітэт па праву называюць у рэспубліцы вялікай школай падрыхтоўкі навуковых і выкладчыцкіх кадраў. Таму я і пачаў сваю гаворку са слоў — «студэнт... аспірант».*

*І. М. ЛУШЧЫЦКІ,*
*прафесар, доктар філасофскіх навук.*



# Яны вызначалі наш лёс

Споўнілася 45 год з дня заснавання Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Гэта дарагая для нас, першых студэнтаў, падзея, знамянальная для ўсёй рэспублікі. Сорак год таму назад я закончыў медфак БДУ. Сэрца маё поўна ўдзячнасці нашаму універсітэту, дарагім настаўнікам, якія прывілі мне любоў да ведаў, да навуковых даследванняў.

З асаблівай сардэчнасцю успамінаю лекцыі буйнага анатома-эвалюцыяніста С. І. Лябёдкіна. Яго лекцыі, а пасля і праца пад яго кіраўніцтвам вызначылі далейшую маю дарогу педагога і навуковага супрацоўніка. Успамінаю таксама і маіх настаўнікаў — прафесара неўрапатолага М. Б. Кроля, тэрапеўта — прафесара С. М. Мелкіх і многіх-многіх іншых, якія таксама аказалі вельмі вялікі ўплыў на маю навуковую дзейнасць.

Першыя гады Беларускі універсітэт адчуваў вялікія цяжкасці ў сувязі з недахопам прафесарска-выкладчыцкіх кадраў па шэрагу спецыяльнасцей. З-за адсутнасці неабходных спецыялістаў асобныя дысцыпліны не чыталіся наогул. Чытанне некаторых курсаў іншы раз вызначалася не патрабаваннямі вучэбнага плана, а наяўнасцю прафесараў і выкладчыкаў па таму ці іншаму прадмету.

Савецкая Беларусь мела вялікую патрэбу ў кваліфікаваных медыцынскіх кадрах. Іх рыхтаваў медыцынскі факультэт універсітэта. Клінікі універсітэта ў першы час працавалі на базе гарадскіх бальніц — Першай савецкай, Другой савецкай і дзіцячай. Але неўзабаве была створана агульная факультэцкая клініка. Вучыцца і працаваць стала лепш. Гэта ўсё нас радавала, і мы старанна вучыліся, нягледзячы ні на што.

Можна не сумнявацца ў тым, што цяперашнія студэнты захаваюць на ўсё жыццё, як беражліва захоўваю і я, светлыя успаміны аб гадах, праведзеных у нашай старэйшай установе рэспублікі.

Сардэчна жадаю выкладчыкам і студэнтам Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Ул. І. Леніна далейшых творчых поспехаў на карысць нашай Радзімы.

**Д. М. ГОЛУБ,**
**прафесар, акадэмік АН БССР, загадчык кафедры анатоміі Мінскага медыцынскага інстытута.**



*Мара ў Ларысы Міхайлавай здзейснілася. Яна — студэнтка універсітэта, які носіць імя Вялікага Леніна.*

# ПАМЯЦЬ СЭРЦА НЕ ЗГАСНЕ

Мне вельмі пашчаслівілася, што я паступіла на вучобу ва універсітэт у юбілейную для яго 45-ю гадавіну. Значыць, тыя, хто быў першымі студэнтамі, будуць святкаваць 45-ю гадавіну свайго паступлення, а я толькі першую, але затое закончу БДУ, калі грамадскасць будзе святкаваць яго 50-годдзе. Гэта мяне вельмі радуе, кліча на паспяховую вучобу, на тое, каб я выйшла са сцен гэтага сапраўднага храма навукі высокакваліфікаваным спецыялістам і прынесла як мага больш карысці Радзіме.

Першыя знаёмствы з універсітэтам, з яго выдатнымі лабараторыямі, аўдыторыямі, вучэбнымі карпусамі гавораць аб тым, што база для паспяховай вучобы ў нас выдатная. А якія цудоўныя выкладчыкі! Толькі на нашым факультэце зараз 7 дактароў навук. Як гэта здорава! Большасць з іх некалі заканчвала наш універсітэт. А колькі выдатных пісьменнікаў выйшла са сцен нашай навучальнай установы!

Гэта дае права ганарыцца, але ніколі не зазнавацца, што ты студэнт універсітэта. І мы на працягу вучобы, а таксама і ў час працы павінны памнажаць яго старонкі слаўнага летапісу, заўсёды несці ў сваіх сэрцах тое, што мы вучыліся ў БДУ імя Ул. І. Леніна.

**Аня АБРАМАВА,**
**студэнтка першага курса філалагічнага факультэта.**

# БЫЛО ХОЛАДНА І ГОЛАДНА...

У 1921 годзе, як толькі быў арганізаваны Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, я быў прыняты ў лік першых студэнтаў.

Памятаю першыя дні вучобы. Холадна, цесна, а часам і голадна. Але ж мы не разгубіліся, упарта і настойліва займаліся.

Для пастпаючых тады ў вышэйшыя школы не было адзінага навучальнага цэнза, і пагэтаму не ўсе студэнты першага набору мелі закончаную сярэднюю адукацыю. Тыя, хто не меў сярэдняй адукацыі, залічваліся ва універсітэт умоўна і павінны былі празпэўны час здаваць экзамены за сярэднюю школу. Цяга да ведаў была вельмі вялікай, асабліва ў студэнтаў старэйшага ўзросту. Многія з іх паспявалі быць і на лекцыях, і на розных цікавых сустрэчах, дыспутах, якія тады праводзілася асабліва многа, і працаваць, каб палепшыць сваё матэрыяльнае становішча і паспяхова працягваць сваю вучобу. Большасць першакурснікаў былі людзьмі, якія прайшлі суровую школу грамадзянскай вайны, былі партыйнымі, камсамольскімі работнікамі. Але цяжкасці не палохалі нас. Бо з кожным годам вучыцца станавілася ўсё лягчэй і лягчэй: паляпшалася матэрыяльная база, ствараліся новыя лабараторыі, друкаваліся падручнікі.

Назаўсёды запамяталіся мне лекцыі такіх вядомых вучоных, як В. І. Пічэта, В. Н. Перцаў, С. Я. Вальфсон і іншых.

Яшчэ ў сценах універсітэта я пачаў навукова-даследчую работу, а па заканчэнню цалкам аддаўся гэтай працы.

У дні гістарычнай даты 45-й гадавіны з дня ўтварэння Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Ул. І. Леніна вітаю Вас, маладыя студэнты, і Вас, дарагія калегі — прафесары і выкладчыкі, з гэтым вялікім святам. Жадаю студэнтам і выкладчыкам захоўваць і памнажаць слаўныя традыцыі універсітэта — рыхтаваць будаўнікоў камуністычнага грамадства.

**Я. Г. РАКАЎ,**
**прафесар кафедры палітэканоміі політэхнічнага інстытута.**



У вылічальным цэнтры універсітэта заўсёды можна сустрэць студэнтаў. Тут для іх — вялікія магчымасці практыкавацца.

# І ЛІЧБЫ ГУЧАЦЬ ПЕСНЯЙ

Гавораць, статыстыка — сумная рэч. Але паслухайце.

У 1921 годзе на першы курс універсітэта паступіла 1390 чалавек, а ў цяперашнім годзе колькасць студэнтаў толькі на дзённым аддзяленні больш, як 6300, акрамя гэтага, на вячэрнім аддзяленні навучаецца 2893, на завочным — 4609, а ўсяго 13843.

Спачатку ў Беларускім дзяржаўным універсітэце было тры факультэты: рабочы. грамадскіх навук і медыцынскі. Цяпер падрыхтоўка вядзецца на васьмі факультэтах. Толькі ў 1966 годзе адкрыта тры новых аддзяленні: геалагічнае, эканамічнае і філасофскае. А вось яшчэ некалькі цікавых параўнанняў: першы выпуск універсітэта (люты 1925 год) не дасягнуў і сотні чалавек (33 эканамісты і 26 юрыстаў), а ў мінулым навучальным годзе дзяржаўныя экзамены паспяхова здалі 1538 чалавек.

Лічбы... лічбы... Іх шмат ляжыць у роўным слупку. Між іншым, чаму ў роўным? Чым далей мы адыходзім ад урачыстага адкрыцця універсітэта, тым яны становяцца ўсё больш і больш шматзначнымі. У 1926 годзе было толькі восем лабараторый, цяпер іх 180, ды і тут галоўнае не ў колькасці. Сучасныя нашы лабараторыі маюць такое навуковае абсталяванне, пра якое першыя практыканты не маглі нават і марыць.

Да 1930 года ў штаце універсітэта было трохі больш за 300 навуковых супрацоўнікаў. Цяпер гэтая лічба паднялася да 1670, з іх 65 прафесараў і дактароў навук, 269 дацэнтаў і кандыдатаў навук.

Можна было б прывесці і яшчэ некаторыя лічбы, але і гэтых дастаткова, каб правільна ацаніць тэмпы нашага росту. Як бачыце, гаворачы словамі аднаго паэта, і «лічбы гучаць песняй».

**1966**

# 1921 ДАРОГА Ў 45 ГОД




Вось так кожнае лета сотні студэнтаў універсітэта накіроўваюцца на працу ў розныя куткі нашай краіны.

## ТРАДЫЦЫЯ—ЮБІЛЯР

*У першыя гады існавання нашага універсітэта ў яго маладым калектыве нарадзілася вельмі добрая традыцыя. 30 кастрычніка 1921 года адбылося ўрачыстае адкрыццё універсітэта, а ўжо праз некалькі дзён выкладчыкі і студэнты пайшлі да рабочых і служачых, каб расказаць пра 4-ую гадавіну Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. З таго часу кастрычніцкія чытанні ў падшэфных арганізацыях сталі традыцыйнымі.*

*І вось у мінулую пятніцу вялікая група выкладчыкаў кафедры гісторыі КПСС на чале з доктарам філасофскіх навук У. М. Сікорскім, супрацоўнікі другіх кафедраў грамадскіх навук прыехалі ў госці да рабочых аўтазавода. Сардэчнай была гэтая сустрэча. Вучоныя расказалі рабочым аб барацьбе за Савецкую ўладу ў Беларусі, аб дасягненнях нашай рэспублікі і ўсёй краіны ў камуністычным будаўніцтве.*

*Штогод толькі членамі таварыства «Веды» нашага універсітэта для насельніцтва рэспублікі чытаецца каля 1500 лекцый і дакладаў.*

*М. Я. РЭЗНІКАЎ,*
*старшыня універсітэцкай арганізацыі таварыства «Веды», кандыдат фізіка-матэматычных навук.*

## УНІВЕРСІТЭТ БУДУЕЦЦА

Той, хто скончыў наш універсітэт некалькі дзесяткаў год таму назад і не бачыў яго карпусоў, не бываў у яго сённяшніх залах і аўдыторыях, кабінетах і лабараторыях, пэўна здзівіцца яго велічнаму росту.

І гэта сапраўды так. Зусім змяніўся наш БДУ за 45 год. І характэрна тое, што і цяпер, як ніколі, ідзе імклівае яго будаўніцтва. Здаецца, толькі ўчора вясёлае студэнцтва пачало слухаць лекцыі ў новым корпусе радыёфізікі і электронікі, як ужо нас здзіўляюць гмахі дзевяціпавярховага будынка хімкорпуса. Праўда, ён яшчэ не закончаны. Але ўжо цяпер можна смела заявіць аб тым, што па прыгажосці ён не адстане ад свайго старэйшага брата — галоўнага корпуса. Але не будзем зарана меркаваць, зойдзем на будоўлю і ўбачым усё сваімі вачыма...

З дзевяціпавярховай вышыні людзі здаюцца такімі маленькімі і нават крыху смешнымі. Усе відаць, як на далоні: карпусы універсітэта... студэнты. Прараб аб'екта Іван Аляксандравіч Лапец усміхаецца. Радуюцца і будаўнікі. Сёння 120 працэнтаў. Так заўжды. Бывае, праўда, і больш 120.

І тут я здагадваюся, чаму так хутка будуецца корпус. Шасцідзённую норму рабочыя А. Семашка, А. Захарчук, В. Трус, А. Русецкі выконваюць за 5. З якім захапленнем я гляджу на іх рытм працы! Вось плечы магутнага крана нясуць вялікую ношку цэглы, а вось ён ужо спяшаецца падаць цэмент. Нездарма кажуць, што кран—гэта дырыжор будоўлі. Ён у надзейных руках Васіля Бозіка, кваліфікаванага знаўца сваёй справы.

Самай вялікай і лепшай на аб'екце лічыцца брыгада Канстанціна Бука. Ён у пашане ў будаўнічым трэсце і ва універсітэце. Канстанцін Вікенцьевіч будаваў галоўны корпус, корпус радыёфізікі і электронікі і вось цяпер будуе хімічны. Семнаццаць год аддаў гэтай прафесіі. Мікалаю Собалю ўсяго васемнаццаць, а ён ужо мае трэці разрад цесляра.

Будаўнікі спяшаюцца, яны ведаюць, як чакаюць гэты корпус студэнты, выкладчыкі. Універсітэцкі гарадок стане яшчэ прыгажэйшым і ў гэтым немалая заслуга будаўнікоў...

Праходзяць каля будучага хімкорпуса студэнты і сівыя прафесары. І ўсе яны глядзяць на яго ўсхвалявана. А там, уверсе, працуюць людзі. Яны не звяртаюць увагі ні на дождж, ні на холад. Ім заўсёды горача. Яны спяшаюцца...

Б. КАПУСЦІН.

## БЕЛАРУСКІ, ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНЫ

### ЯК РОДНЫ ДОМ

Калі мы прыехалі ў Савецкі Саюз, нам сказалі, што будзем вучыцца ў горадзе Мінску. Нас накіравалі на падрыхтоўчы факультэт універсітэта імя Ул. І. Леніна. Тут прышлося на працягу аднаго года вывучаць, акрамя рускай мовы у аб'ёме праграмы сярэдняй школы і фізіку, і хімію, і матэматыку.

Першыя нашы крокі ў вучобе былі нялёгкімі. Мы ведалі толькі некалькі рускіх слоў, здавалася, мы ніколі не авалодаем гэтай мовай. Але нас маральна акрылялі добрыя, чулыя адносіны савецкіх сяброў. Гэта былі студэнты розных факультэтаў нашага універсітэта. Я кажу «нашага» таму, што універсітэт стаў для нас родным домам. Савецкія студэнты заўсёды былі гатовы нам аказаць любую дапамогу, даць каштоўныя парады, вучылі нас усяму лепшаму, чаму толькі можа навучыць такая цудоўная савецкая моладзь, пакаленне будаўнікоў камунізма.

Нам заўсёды здаецца, што жывём сярод братоў.

Нічым не змераеш тое ўсё добрае, што зрабілі і робяць для нас савецкія выкладчыкі, якія рыхтуюць з нас будучых высокакваліфікаваных спецыялістаў да актыўнага ўдзелу ў будаўніцтве новага жыцця на Кубе.

З 1963 года на Кубе штогод праводзяцца пленумы кубінскіх студэнтаў, якія вучацца за мяжой. На гэтых пленумах кубінскія выкладчыкі цікавяцца педагагічным вопытам савецкіх выкладчыкаў. Гэта дапамагае ім у выхаванні маладога пакалення.

Ад імя ўсіх кубінскіх студэнтаў універсітэта горача віншую нашых дарагіх выкладчыкаў, усіх супрацоўнікаў і студэнтаў універсітэта з 45-й гадавінай Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Ул. І. Леніна і жадаю творчых поспехаў і шчасця.

Няхай жыве і квітнее наш універсітэт!

**Эміліо Касандэва, кубінскі студэнт V курса фізфака універсітэта.**

## ДЗЯКУЙ, ВЫКЛАДЧЫКІ

**Мы, студэнты падрыхтоўчага факультэта БДУ імя Ул. І. Леніна — дзеці розных народаў — віншуем усіх прафесараў, выкладчыкаў, савецкіх і замежных студэнтаў з 45-годдзем універсітэта — нашай дарагой альма матэр. Нам вельмі прыемна адчуваць, што мы з'яўляемся членамі яе адзінай вялікай інтэрнацыянальнай сям'і. Мы ганарымся тым, што нам выпала вялікае шчасце вучыцца ва універсітэце, які носіць імя Вялікага Леніна.**

**Ад усяго сэрца вітаем выкладчыкаў і студэнтаў, віншуем іх са слаўным юбілеем, жадаем новых поспехаў у працы і вучобе.**

**Ад імя студэнтаў падрыхтоўчага факультэта**

**Нгуен Ча [ДРВ],**
**Самсон Акомбі [Конга] [Бразавіль],**
**Марсель Кулунамі [ЦАР],**
**Мікаэль Афадзіле [Нігерыя],**
**Алік Мвева [Замбія],**
**Ісайя Сібанда [Радэзія],**
**Самуэль Бвамбі [Камерун].**



*Мастацкая самадзейнасць — яшчэ адна універсітэцкая школа ўсебаковага развіцця студэнтаў. На гэтым здымку вы бачыце выступленне харэаграфічнай групы.*

## Спорт

### ТРАФЕІ ШАШЫСТАЎ

Дзесяць дзён у памяшканні рэспубліканскага шахматна-шашачнага клуба працягваўся фестываль рэспублікі. Сем каманд спартыўных таварыстваў і ведамстваў аспрэчвалі званне чэмпіёна. Усе мацнейшыя шашысты рэспублікі сабраліся ў гэтыя дні ў Мінску. Сярод удзельнікаў былі міжнародны майстар М. Шавель, экс-чэмпіён СССР А. Плахін, чэмпіёны рэспублікі Л. Соркіна, Г. Хацкевіч, вядомыя майстры і мацнейшыя кандыдаты ў майстры. Сярод 49 удзельнікаў быў 21(!) прадстаўнік нашага універсітэта. Толькі калектыў дарожнага савета «Лакаматыў» не меў у сваім складзе прадстаўнікоў універсітэта. Відавочна, пагэтаму ён і заняў апошняе месца.

Званне чэмпіёнаў заваявала першая каманда ДСО «Буравеснік», якая выступала ў наступным складзе: майстар спорту Г. Хацкевіч, Я. Кухарчук, А. Гантварг, Л. Соркіна і першаразрадніца А. Хапалюк (усе БДУ), майстры спорту В. Прыяткін (радыётэхнічны інстытут) і І. Сцяпанаў (Віцебскі медінстытут). Асабліва адзначыліся ў камандзе Я. Кухарчук, Л. Соркіна, А. Хапалюк, якія занялі першае месца на дошках. Другое месца занялі шашысты «Чырвонага сцягу» і на трэцім зноў былі студэнты — другая зборная «Буравесніка» у складзе Б. Бліндэра, Б. Агашына, В. Беляўскага, Л. Ільіной, Л. Лаўрыновіча, А. Сялента і С. Клейнберга, які паказаў лепшы вынік на дошцы.

Члены каманд-пераможцаў узнагароджаны залатымі медалямі, а члены каманд, якія занялі другое і трэцяе месцы, атрымалі сярэбраныя і бронзавыя медалі.

У выніку з 21 розыгрышнага медалю 11 (5 залатых, 2 сярэбраныя і 4 бронзавыя) заваявалі шашысты універсітэта. Гэта вялікі поспех нашых спартсменаў.

Г. ДРАБУШЭВІЧ.

## Паведамленне

31 кастрычніка 1966 года, а 10 гадзіне, у актавай зале галоўнага корпуса адбудзецца агульнауніверсітэцкая прафсаюзная канферэнцыя.

Прафком.

# 1966

Рэдактар М. І. ІОСЬКА.

АТ 01139 Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 112, тэл. 2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда». Зак. 1353.